## СЕКЦЫЯ 8. МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

# АНАЛІЗ ПАНЯЦЦЯ «ІНТЭГРАТЫЎНЫ ПАДЫХОД» У АСПЕКЦЕ МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ ЛІТАРАТУРЫ

**М. В. Баравік**

*ДУА «Сярэдняя школа № 186 г. Мінска», Нацыянальны інстытут адукацыі, вул. А. Бачылы, 38, 220075, г. Мінск, Беларусь, maxbaravik@gmail.com*

Прадметам даследавання з'яўляецца разгляд інтэгратыўнага падыходу ў метадычным аспекце. Дадзенае даследаванне тэарэтычнае і заснавана на аналізе катэгарыяльных паняццяў і падыходаў, прынятых у дыдактыцы і методыцы навучання літаратуры. Тэарэтычна вывучана і канкрэтызавана значэнне тэрмінаў «сістэмны падыход», «інтэгратыўны падыход», «міжпрадметны падыход», «метапрадметны падыход».

***Ключавыя словы:*** беларуская літаратура; інтэграцыя; інтэгратыўны падыход.

# АНАЛИЗ ПОНЯТИЯ «ИНТЕГРАТИВНЫЙ ПОДХОД» В АСПЕКТЕ МЕТОДИКИ ПРЕПОДАВАНИЯ ЛИТЕРАТУРЫ

**М. В. Боровик**

*ГУО «Средняя школа № 186 г. Минска», Национальный институт образования, ул. А. Бачило, 38, 220075, г. Минск, Беларусь, maxbaravik@gmail.com*

Предметом исследования является рассмотрение интегративного подхода в методическом аспекте. Данное исследование теоретическое и основано на анализе категориальных понятий и подходов, принятых в дидактике и методике обучения литературе. Теоретически изучено и конкретизировано значение терминов «системный подход», «интегративный подход», «межпредметный подход», «метапредметный подход».

***Ключевые слова:*** белорусская литература; интеграция; интегративный подход.

Паняцце «падыход» уяўляе сабой базісную катэгорыю методыкі, якая вызначае стратэгію навучання і выбар метаду навучання.

У якасці аднаго з асноўных метадалагічных падыходаў да навучання літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі Рэспублікі Беларусь разглядаецца сістэмны падыход, які прадугледжвае спасціжэнне складанага цэлага праз яго расчляненне на ўсё больш і больш простыя складнікі і вывучэнне іх сутнасці. У метадычнай навуцы сістэмны падыход карэлюе з інтэгратыўным падыходам, які вызначае стратэгію навучання

беларускай літаратуры і знаходзіць адлюстраванне ў кампанентах сістэмы навучання – мэтах, задачах, прынцыпах, змесце, метадах і прыёмах, формах навучання, якія забяспечваюць рэалізацыю гэтай стратэгіі.

Тэарэтычныя асновы навучання літаратуры ў аспекце інтэгратыўнага падыходу разглядаліся беларускімі і замежнымі вучонымі-літаратуразнаўцамі, метадыстамі, педагогамі В. Б. Акімавай, В. І. Анісімавым, А. Л. Ахматавай, Т. Г. Бражэ, В. А. Даманскім, С. А. Жылай, І. А. Зімняй, А. В. Зямцовай, М. А. Івановым, У. М. Лапаткіным, У. Г. Маранцманам, А. І. Пайгусавым, В. У. Праскаловіч, С. Р. Прыбылых, А. В. Руцкай, І. Г. Яленскім і інш.

Тэрмін «інтэгратыўны падыход» пакуль не знайшоў адназначнага тлумачэння ў педагагічнай літаратуры, сустракаюцца розныя назвы адзначанага падыходу: міжпрадметны, міждысцыплінарны, метапрадметны, інтэгратыўна-дыферэнцыраваны і інш.

Найбольшай праблемай у дадзеным кантэксце ўяўляецца размежаванне паняццяў «інтэгратыўны падыход» і «міжпрадметны падыход». Прычына неадназначнасці трактовак заключаецца «не столькі ў нядбайнасці аперыравання тэрмінам, колькі ў аб’ектыўна існуючым шматфункцыянальным характары саміх міжпрадметных сувязей» [1, с. 45]. Прааналізаваныя працы дазваляюць прыйсці да высновы, што дэфініцыя міжпрадметных сувязей зводзіцца да такіх універсалій, як «умова», «сродак», «заканамернасць», «адносіны». Зыходзячы з гэтага, можна сцвярджаць, што апісаны тэрмін варта разглядаць не з пункту гледжання методыкі навучання, а ў якасці дыдактычнай катэгорыі. Дадзены тэзіс пацвярджаецца азначэннем, змешчаным у «Расійскай педагагічнай энцыклапедыі», дзе пазначана, што міжпрадметны падыход – гэта «комплексны падыход да выхавання і навучання, які дазваляе вычленіць як галоўныя элементы зместу навучання, так і ўзаемасувязі паміж вучэбнымі прадметамі» [2, с. 563]. Падобным жа чынам варта разглядаць і тэрмін «міждысцыплінарны падыход», які выкарыстоўваецца ў адносінах да навучання ва ўстановах вышэйшай адукацыі.

У канцы XX ст. у педагогіцы атрымаў развіццё метапрадметны падыход, тэарэтычная база якога найбольш актыўна распрацоўвалася ў даследаваннях А. Р. Асмолава, Н. В. Грамыка, Ю. В. Грамыкі і А. В. Хутарскога. Пад метапрадметным падыходам разумеецца такі падыход, які прадугледжвае «фарміраванне цэласнага вобразу свету, пераадоленне раз’яднанасці вучэбных прадметаў, авалоданне спосабамі дзейнасці, якія можна прымяніць пры вырашэнні рэальных жыццёвых праблем, забяспечвае цэласнасць агульнакультурнага, асобаснага і пазнавальнага развіцця і самаразвіцця дзіцяці, пераемнасць усіх ступеняў

адукацыйнага працэсу» [3, с. 63]. Базісам дадзенага падыходу з’яўляецца паняцце метапрадметнасці, якую варта разглядаць як прынцып навучання агульным прыёмам, схемам, тэхнікам, узорам разумовай работы, якія знаходзяцца над прадметамі, што ўзнаўляюцца падчас работы з любым прадметным матэрыялам.

Мэта рэалізацыі метапрадметнага падыходу – фарміраванне метапрадметных вынікаў засваення зместу навучання, якія адлюстроўваюць гатоўнасць вучня да вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, засваенне ўніверсальных вучэбных дзеянняў і міжпрадметных паняццяў. У канцэпцыі метапрадметнага навучання А. В. Хутарскога названы падыход на практыцы рэалізуецца праз увядзенне новых спецыяльных метапрадметаў. Разам з тым М. Д. Дамер, Г. С. Беражная сцвярджаюць, што ўвядзенне дадатковых прадметаў павялічыць нагрузку школьнікаў або прывядзе да змяншэння колькасці гадзін на вывучэнне традыцыйных вучэбных прадметаў, і бачаць вырашэнне праблемы ва ўвядзенні ў структуру прадметнай тэмы элементаў метапрадметнасці або ў распрацоўцы і ўкараненні метапрадметных праграм – праграм дасягнення метапрадметных адукацыйных вынікаў у межах сумеснай дзейнасці вучняў і настаўніка, якія рэалізуюцца ў працэсе рашэння сітуацыйных заданняў [3, с. 63].

Разам з тым метапрадметны падыход – гэта тэхналогія, тактыка дзейнасці, якая скіравана на пераўтварэнне адукацыйных прадуктаў, спосаб рэалізацыі метапрадметнасці. Па сутнасці, дадзены падыход заснаваны на прынцыпе інтэграцыі, паколькі прадугледжвае аб’яднанне, узаемапранікненне і ўзаемасувязь зместу навучання, а таксама відаў вучэбнай дзейнасці. Зыходзячы з гэтага, інтэграцыю варта разглядаць як інструмент, на аснове якога ўзнікае метапрадметнасць. Пры гэтым адрозненне паміж інтэграцыяй і метапрадметнасцю заключаецца ў тым, што першая прадугледжвае дапаўненне аднаго вучэбнага прадмета другім вучэбным прадметам, тады як метапрадметнасць арыентавана на атрыманне новых ведаў больш высокага ўзроўню, якія носяць універсальны характар і заснаваны на стратэгіі пазнання і самарэгуляцыі.

Інтэгратыўна-дыферэнцыраваны падыход да навучання, які распрацаваны В. В. Коршунавай, прадугледжвае, з аднаго боку, інтэграцыю зместу навучання, форм, метадаў, прыёмаў і тэхналогій навучання і, з другога боку, «арганізацыю засваення элементаў школьных ведаў рознай цяжкасці з улікам індывідуальных асаблівасцей вучняў шляхам прапанавання ім розных аб’ёмаў інфармацыі, заданняў, часу, тэмпу дзейнасці» [4, с. 15].

На нашу думку, выкарыстаная фармулёўка назвы падыходу характарызуецца неадназначнасцю. Справа ў тым, што асобнай метадалагічнай праблемай вывучэння інтэграцыі з'яўляецца пошук суадносінаў паміж працэсамі інтэграцыі і дыферэнцыяцыі. У дадзеным выпадку даследчык яднае побач з назвай стратэгічнага падыходу да навучання, які рэалізуецца ў кампанентах сістэмы навучання, назву метадычнага прынцыпу, звязанага з канкрэтным аперацыйным прымяненнем на практыцы. Фактычна адбываецца змяшэнне тэрміналагічнага апарату і педагагічных катэгорый, што ўносіць няпэўнасць у і без таго вялікую і супярэчлівую колькасць трактовак тэрміналагічнага поля інтэграцыі.

У сваю чаргу, інтэгратыўны падыход вучоныя таксама трактуюць па-рознаму. Так, І. А. Зімняя і А. В. Зямцова вызначаюць інтэгратыўны падыход як «цэласнае ўяўленне сукупнасці аб'ектаў, з'яў, працэсаў, якія аб'ядноўваюцца агульнасцю як мінімум адной з характарыстык, у выніку чаго ствараецца яго новая якасць» [5, с. 17]. Паводле У. М. Лапаткіна, інтэгратыўны падыход – сродак, які забяспечвае «цэласнасць карціны свету; садзейнічае развіццю здольнасцей чалавека да сістэмнага мыслення падчас вырашэння тэарэтычных і практычных задач» [6, с. 162]. М. С. Пак вызначае інтэгратыўны падыход як «метадалагічны падыход, які арыентуе суб'екты на цэласнае аб'яднанне (інтэграцыю) пэўных кампанентаў пры рашэнні стратэгічных і тактычных задач адукацыі (навукі)» [7, с. 22]. С. А. Ларыёнава сцвярджае, што інтэгратыўны падыход уяўляе сабой «збалансаванае прымяненне выкарыстаных у вучэбнай дзейнасці метадаў і прыёмаў, якое дазваляе авалодаць новым абагульненым дастаткова выніковым дзеяннем» [8, с. 121]. Згодна з азначэннем А. Л. Ахматавай, інтэгратыўны падыход – «гэта метадалагічная сістэма, якая аб'ядноўвае сукупнасць метадычных прыёмаў, у аснове якіх ляжыць прынцып аб'яднання ў адзінае цэлае тых ці іншых частак, ступеняў, формаў і элементаў зместу і тэхналогіі навучання» [9, с. 4]. У апошняй дэфініцыі найбольш поўна раскрываецца сутнасць названай з'явы, якая разглядаецца як «метадалагічны інструментарый» (у тэрміналогіі А. І. Пайгусава) – сукупнасці канкрэтных практычных аперацый, скіраваных на стратэгічнае вырашэнне педагагічных і метадычных праблем.

Інтэгратыўны падыход да навучання літаратуры рэалізуецца на трох узроўнях – зместавым, арганізацыйна-дзейнасным, метадычным. Для першага ўзроўню характэрна паралельнае выкарыстанне ў блізкароднасных вучэбных дысцыплінах адных і тых жа азначэнняў і паняццяў. Да таго ж *зместавы кампанент* прадугледжвае якасны адбор матэрыялу, які характарызуецца падабенствам або супадзеннем аб'ектаў

вывучэння, выкарыстаннем блізкіх ці аднолькавых метадаў вывучэння, тоеснасцю тэарэтычных канцэпцый вывучаемых дысцыплін. Паводле В. У. Праскаловіч, «уключэнне ў змест навучання беларускай літаратуры дыдактычных адзінак сумежнага паняційна-тэрміналагічнага апарату аблегчыць працу настаўніка і вучняў, паколькі гэта не патрабуе засваення дадатковага аб'ёму літаратура-, культура-, мастацтвазнаўчай інфармацыі» [10, с. 7]. Структура *арганізацыйна-дзейнаснага ўзроўню* ўяўляе сабой сукупнасць разнастайных форм вучэбнай і пазавучэбнай дзейнасці, метадычных сродкаў навучання літаратуры (метады, прыёмы, формы работы, тэхналогіі). Сутнасць *метадычнага кампанента* пры рэалізацыі інтэгратыўнага падыходу заключаецца ў запазычанні і трансфармацыі метадаў навучання з роднасных дысцыплін, якія ў канкрэтным выпадку інтэгруюцца.

Ідэі інтэгратыўнага падыходу да навучання літаратуры ў пэўным сэнсе карэлююць з метадалагічнымі перадумовамі і прынцыпамі пабудовы зместу адукацыі, замацаванымі ў дзейных канцэпцыях вучэбных прадметаў «Беларуская літаратура», «Русская литература». Маюцца на ўвазе арыентацыя на засваенне набыткаў нацыянальнай культуры ў адзінстве з агульначалавечымі каштоўнасцямі, фундаментальнасць літаратурнай адукацыі, прынцыпы адзінства зместу і формы, часткі і цэлага ў спасціжэнні мастацкага твора чытачом, прынцып абавязковай актуалізацыі міжпрадметных сувязей і інш.

Аб скаардынаванасці курсаў беларускай і рускай літаратуры на аснове прынцыпу адзінства літаратурнай адукацыі сказана ў Канцэпцыі вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» і ў Канцэпцыі вучэбнага прадмета «Русская литература»: «Беларуская літаратура разам з іншымі прадметамі сацыяльна-гуманітарнага цыкла [“Руская літаратура”, “Беларуская мова”, “Руская мова”, “Замежная мова”, “Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)”, “Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі”, “Грамадазнаўства”, “Музыка”, “Выяўленчае мастацтва”] утварае аснову культурацэнтрычнай сістэмы адукацыі. Міжпрадметныя сувязі актуалізуюцца на ўсіх этапах навучання, іх рэалізацыя ў адукацыйным працэсе ўзбагачае дыялог літаратуры з іншымі відамі мастацтва (жывапіс, музыка, фотамастацтва, кіно, тэатр і інш.), эфектыўна ўздзейнічае на маральна-этычнае, інтэлектуальнае, эмацыянальнае, эстэтычнае развіццё асобы» [11, с. 53]. Сучасны аналіз агульнасусветных тэндэнцый развіцця адукацыйнай прасторы падводзіць да высновы, што інтэгратыўны падыход вымагае аб'яднання не толькі зместу навучання, але і тэхналогій, метадаў і форм выкладання.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Зверев И. Д. Межпредметные связи в современной школе. М. : Педагогика, 1981.
2. Российская педагогическая энциклопедия : в 2 т. / гл. ред. В. В. Давыдов. М. : Большая рос. энцикл., 1993–1999.
3. Бережная Г. С. Реализация метапредметного подхода в основной школе // Вестн. Балт. федер. ун-та им. И. Канта. Сер. : Филология, педагогика, психология. 2016. № 4. С. 62–67.
4. Коршунова О. В. Интегративно-дифференцированный подход к обучению в сельской школе (на примере предмета «Физика») : автореф. дис. ... д-ра. пед. наук : 13.00.01 / Вят. гос. ун-т. Киров, 2006.
5. Зимняя И. А., Земцова Е. В. Интегративный подход к оценке единой социальнопрофессиональной компетентности выпускников вузов // Высш. образование сегодня. 2008. № 5. С. 14–19.
6. Лопаткин В. М. Интеграционные процессы в региональной системе педагогического образования. Барнаул : Изд-во БГПУ, 2000.
7. Пак М. С. Непрерывное химическое образование: методологические ориентиры // Изв. РГПУ им. А. И. Герцена. 2007. № 8. С. 19–27.
8. Ларионова С. А. Реализация интегративного подхода в системе обучения первоклассников грамоте : дис. ... канд. пед. наук : 13.00.02. Тамбов, 2009.
9. Ахматова Е. Л. Интегративный подход в литературном образовании учащихся 5–9 классов (на материале изучения творчества М. Ю. Лермонтова) : дис. … канд. пед. наук : 13.00.02. М., 2012.
10. Праскаловіч В. У. Тэарэтыка-метадычная сістэма сродкаў культуратворчага развіцця вучняў V–XI класаў у працэсе навучання беларускай літаратуры : аўтарэф. дыс. … д-ра пед. навук : 13.00.02 / Нац. ін-т адукацыі. Мінск, 2015.
11. Канцэпцыя вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» (V–XI класы). Праект / В. У. Праскаловіч [і інш.] // Род. слова. 2016. № 3. С. 51–60.